ВЕСЦІ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСКАЙ ССР
№ 5 1949

*В. Е. ЛАБАНОК,*
*сакратар Палескага абкома КП(б)Б*

# СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА ПАЛЕССЯ У ПАСЛЯВАЕННЫ ПЕРЫЯД

Да Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі працоўныя Палесся, як і ўвесь беларускі народ, знаходзіліся пад жорсткім палітычным, эканамічным і нацыянальным прыгнётам царызма. Палессе было самым глухім і адсталым кутком Беларусі. Сама назва Палессе была сінонімам цемры і адсталасці. Пазбаўленыя ў большасці сваёй зямлі, сяляне бязлітасна эксплаатаваліся памешчыкамі і капіталістамі.

З даных статыстыкі пазямельнай уласнасці 1877 г. відаць, што па Мазырскаму павету толькі 18 прац. зямлі належала сялянам. Астатняя зямля была ўласнасцю памешчыкаў. Засілле памешчыкаў тут было большае, чым у іншых павятах Беларусі, дзе сяляне мелі ў сваім карыстанні 33,5 прац. зямельных угоддзяў.

Мізэрныя зямельныя ўчасткі, якія знаходзіліся ў карыстанні сялян, своечасова не апрацоўваліся з прычыны адсутнасці цягла і інвентара. У 1913 г. у Мазырскім павеце 3513 сялянскіх гаспадарак не мелі рабочай жывёлы, 1522 гаспадаркі былі бескароўнымі, 951 зусім не мела ніякай хатняй жывёлы. Як правіла, у большасці сялян заўсёды нехапала хлеба да новага ўраджаю, а ў неўраджайныя гады тысячы сем'яў былі асуджаны на хранічнае недаяданне і галодную смерць. Беззямелле, невыносна вялікія падаткі і высокая арэндная плата канчаткова разаралі сялян, прымушалі іх наймацца батракамі да кулакоў і памешчыкаў, шукаць сродкаў да існавання на старане. Як мінімум, 40 прац. мужчын Мазырскага павету ва ўзросце ад 16 да 60 год працавалі і на адыходных промыслах.

Галоднае, цяжкае жыццё накладала свой адбітак на ўсе бакі быту. Захворванні і смяротнасць павялічваліся з кожным годам. Са справаздач Мінскага земства відаць, што Мазырскі павет быў ачагом малярыйных захворванняў. У 1907 г. малярыяй хварэла 6652 чалавекі. У 1908 г. агульная колькасць захворванняў павялічылася да 15000. Гэта, вядома, заніжаныя даныя, таму што большая частка насельніцтва не звярталася за медыцынскай дапамогай і нікому не заяўляла аб сваіх хваробах. Хвароба «калтун» была настолькі распаўсюджанай, што наогул не паддавалася ўліку. Аб ахове здароўя працоўных не магло быць і гутаркі. У 1896 годзе на тэрыторыі Мазырскага павета была толькі адна сельская больніца на 10 ложкаў і тры ўрача, з якіх адзін павятовы і два сельскія.

88,4 прац. усяго насельніцтва Палесся было непісьменным. На тэрыторыі Палесся мелася ўсяго тры гімназіі і тры гарадскія вучылішчы, якія былі даступны толькі дзецям багатых. Па ўсёй вобласці было каля 150 пачатковых школ, але нават дзеці, якія пражывалі ў пунктах знаходжання гэтых школ, не мелі магчымасці іх наведваць.

З даных перапісу 1911 г. відаць, што ў Мазырскім павеце на кожныя 100 дзяцей, якія навучаліся ў першым класе, на другі клас прыходзілася толькі 41, а на чацверты — толькі 4. Гэта значыць, што з кожных 25 чалавек, паступаўшых у пачатковую школу, канчаў яе толькі адзін.

Народны паэт БССР Янка Купала ў сваёй выдатнай паэме «Над ракой Арэсай» так малюе жыццё дарэвалюцыйнага Палесся:

Жывуць людзі ў хатах,
Плятуць сабе лапці,
Каб з торбай у латах
Пайсці жабраваці.

Пад шум бесканечны
Бярозаў і соснаў,
Сахой недарэчнай
Аруць пясок млосна.

Іх розум балота
Трымае палонна,—
Красуе цямнота,
Растуць забабоны.

Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэвалюцыя ліквідавала палітычны, эканамічны і нацыянальны прыгнёт. Беларускі народ упершыню за сваю шматвяковую гісторыю атрымаў дзяржаўнасць.

Зямля, аб якой марылі многія пакаленні сялян, не належыць больш памешчыкам і капіталістам і перайшла ва ўласнасць народа. Адмена прыватнай уласнасці на зямлю, пераразмеркаванне зямлі ў інтарэсах сялян-беднякоў і сераднякоў паскорылі адраджэнне сельскай гаспадаркі і ўздым матэрыяльнага ўзроўню працоўных мас вёскі.

Карэнныя змяненні ў развіцці сельскай гаспадаркі адбыліся ў сувязі з правядзеннем калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва як класа. «Гэта быў, — гаворыць таварыш Сталін, — найглыбейшы рэвалюцыйны пераварот, скачок з старога якаснага становішча грамадства ў новае якаснае становішча, раўназначны па сваіх выніках рэвалюцыйнаму перавароту ў кастрычніку 1917 года».

У рукі калгасаў перайшлі не толькі зямельныя надзелы сялян-аднаасобнікаў, уступіўшых у калгас, але і землі кулакоў. Калгасам былі выданы дзяржаўныя акты на вечнае карыстанне зямлёй. На службу соцыялістычнай сельскай гаспадарцы была пастаўлена магутная механізаваная база.

У Палескай вобласці былі арганізаваны 22 машынна-трактарныя станцыі. На калгасных палях працавала шмат трактараў, 116 камбайнаў, вялікая колькасць складаных малатарань, трактарных плугоў, сеялак, культыватараў, лушчыльнікаў, ільноцерабілак, бульбасаджалак і іншых сельскагаспадарчых машын.

Пасеўныя плошчы калгасаў складалі 233800 *га*. Шырока прымяняліся агратэхнічныя мерапрыемствы, накіраваныя на павышэнне ўраджайнасці.

Легенда аб тым, што палесская зямля з'яўляецца неплодароднай, што тут нельга дабіцца высокіх ураджаяў, была развеяна гераічнай працай калгаснікаў і калгасніц. Ва Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы прымалі ўдзел дзесяткі палескіх калгасаў, сотні лепшых паляводаў, жывёлаводаў, наватараў соцыялістычнай сельскай гаспадаркі. Перадавікі сельскай гаспадаркі — лепшыя звеннявыя, брыгадзіры, працаўнікі жывёлагадоўчых ферм, старшыні калгасаў, спецыялісты сельскай гаспадаркі — узнагароджаны ордэнамі і медалямі СССР, залатымі і срэбранымі медалямі Галоўвыстаўкома:

З кожным годам расла колькасць калгасаў, якія дабіваліся высокай ураджайнасці збожжавых, бульбы, тэхнічных, гароднінных і іншых культур. Калгас імені Тэльмана, Брагінскага раёна, у 1940 г. сабраў ураджай збожжавых з усёй плошчы пасеву па 15 *ц* з *га*, бульбы — па 190 *ц*, табаку—па 44 *ц*, гароднінных культур—па 360 *ц*, а з асобных участкаў азімай пшаніцы — па 35 *ц* і ячменю — па 25 *ц* з *га*.

Член гэтай сельгасарцелі Радчанка Міна на выпрацаваныя ім працадні атрымаў 1600 *кг* збожжа, 9100 *кг* бульбы, 900 *кг* фруктаў, 535 *кг* гародніны, 400 *л* малака, 26 *кг* мёду, 82 *кг* тлушчаў, 1800 *кг* фуражу і 5995 рублёў грашыма. У членаў гэтай сельгасарцелі ёсць веласіпеды, патэфоны, радыё, кнігі і т. п. За выдатныя поспехі ў развіцці сельскай гаспадаркі калгас імені Тэльмана быў узнагароджан вышэйшай урадавай узнагародай — ордэнам Леніна.

Калгас «Савецкая Беларусь», Тураўскага раёна, з усёй плошчы пасеву збіраў па 21,5 *ц* пшаніцы і па 19 *ц* жыта з *га*.

Калгас «Чырвоныя Лукі», Васілевіцкага раёна, на асушаных землях атрымаў у 1940 г. ураджай збожжавых культур 21 *ц* з *га*, бульбы— 230 *ц*, сена — 79 *ц* з *га*. За кошт асвоеных балот калгас павялічыў у 1940 г. у параўнанні з 1936 г. валавы збор сена да 5600 *ц*.

У перадваенныя гады ў вобласці шырока культываваліся пасевы такіх тэхнічных культур, як паўднёвыя каноплі, махорка, кок-сагыз. У Хойніцкім, Брагінскім і іншых раёнах усё больш пашыраліся бахчавыя культуры, паўднёвыя сарты пладовых дрэў, а таксама вінаград, які многія калгасы пачалі разводзіць як таварную культуру.

Няспынна расла грамадская жывёлагадоўля. Было створана звыш 3000 таварных жывёлагадоўчых ферм. Штогод расло пагалоўе жывёлы і прадукцыйнасць жывёлагадоўлі, раслі даходы калгасаў, матэрыяльны і культурны дабрабыт калгаснікаў.

У вобласці мелася каля тысячы школ, у якіх працавала да 5000 настаўнікаў і навучалася звыш 130 тысяч школьнікаў, 17 школ рабочай і сельскай моладзі, 87 дзіцячых садоў, вялікая сетка лячэбных устаноў, у якіх працавала 175 урачоў, не лічачы медыцынскіх працаўнікоў сярэдняй кваліфікацыі, 503 клуба, 488 масавых бібліятэк, драматычны тэатр, шырокая сетка кіноўстановак і т. д.

Пад кіраўніцтвам ЦК ВКП(б), саюзнага ўрада і асабіста таварыша Сталіна, пры дапамозе брацкіх народаў Савецкага Саюза і, у першую чаргу, вялікага рускага народа, Беларуская рэспубліка, а разам з ёй і Палеская вобласць, стала адной з перадавых рэспублік у Саюзе.

Калгаснікі вобласці пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый прыступілі да выканання прынятай па ініцыятыве таварыша Сталіна пастановы Савета Народных Камісараў СССР і Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) ад 6 сакавіка 1941 г. «Аб асушэнні балот у Беларускай ССР і выкарыстанні асушаных зямель калгасамі для расшырэння пасеўных плошчаў і сенажаці».

Ажыццяўленне гэтай грандыёзнай сталінскай праграмы павінна было ператварыць беларускія балоты, якія з'яўляліся раней крыніцай жабрацтва, хвароб и бездарожжа, у высокаўраджайныя калгасныя палі — крыніцу багацця калгасаў і калгаснікаў. Але мірная творчая праца нашага народа была спынена вераломным нападам нямецка-фашысцкіх захопнікаў на нашу сацыялістычную Радзіму.

За час свайго гаспадарання гітлераўскія акупанты нанеслі сельскай гаспадарцы вобласці велізарныя страты. Яны зусім разграбілі калгасы, машынна-трактарныя станцыі, навучальныя сельскагаспадарчыя ўстановы. Толькі па аднаму калгаснаму сектару страты, нанесеныя нямецкімі

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

захопнікамі, складаюць больш 4,5 млрд. рублёў. У выніку нямецкага гаспадарання пасеўная плошча збожжавых культур рэзка паменшылася. Зусім былі парушаны севазвароты, знішчаны пасевы кок-сагызу, махоркі і шматгадовых траў. Цалкам было ліквідавана калгаснае гародніцтва.

Нямецка-фашысцкія захопнікі разграбілі грамадскую жывёлу калгасаў і жывёлу калгаснікаў. Амаль цалкам знішчана было пагалоўе свіней, птушкі, а таксама пчалярства. У радзе раёнаў (Капаткевіцкім, Петрыкаўскім і інш.) амаль не засталося коней, буйнай рагатай жывёлы, свіней, авечак і коз. У Даманавіцкім раёне да вайны было 10443 галавы авечак і коз і 7734 галавы свіней. Пасля немцаў у раёне засталося толькі 15 авечак.

Вытворчыя і гаспадарчыя будынкі калгасаў, а таксама палавіна жылых дамоў былі спалены і разбураны фашысцкімі бандытамі.

Гітлераўскім прыгнятальнікам не ўдалося, аднак, зламаць патрыятычны дух свабодалюбівых савецкіх людзей. Палеская зямля гарэла пад нагамі нямецкіх акупантаў. Без малога 75 прац. тэрыторыі вобласці кантралявалі партызаны аж да прыходу часцей Савецкай Арміі. Пад аховай партызан знаходзілася больш 200 тысяч чалавек мірнага насельніцтва.

Пасля вызвалення ад нямецкіх захопнікаў калгаснае сялянства вобласці з вялікім натхненнем узялося за аднаўленне сацыялістычнай сельскай гаспадаркі. За кароткі тэрмін былі адноўлены ўсе калгасы, соўгасы, створаны 24 машынна-трактарныя станцыі. Аднаўленне калгасаў адбывалася пры вялікім палітычным уздыме працаўнікоў сацыялістычнай сельскай гаспадаркі вобласці.

Веснавую сяўбу 1944 г. калгасы Палесся праводзілі ва ўмовах, калі частка вобласці была яшчэ пад пятой фашысцкіх акупантаў, а частка знаходзілася ў зоне баявых дзеянняў або ў непасрэднай блізкасці да фронта. Праяўляючы выключную самаахвярнасць і вытрымку, калгаснікі пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый забяспечылі арганізаванае правядзенне сяўбы. Толькі ў адным Малажынскім сельсавеце, Брагінскага раёна, уручную было ўскапана 272 *га*. Ускапванне зямлі ўручную, а таксама прыцягненне да палявых работ кароў асабістага карыстання там, дзе яны былі, шырока прымянялася ва ўсіх раёнах вобласці. 10 чэрвеня вобласць выканала план веснавой сяўбы на 101,9 прац.

План абавязковых паставак збожжа і бульбы быў таксама выканан датэрмінова. Звыш плана, у фонд Савецкай Арміі, калгасы вобласці здалі 155 тысяч пудоў збожжа.

На 150 прац. быў выканан гадавы план трактарных работ.

Вялікая работа пачалася па адбудове дамоў для сельскага насельніцтва, якое жыло ў зямлянках. Ужо ў 1944 г. было пабудавана 18057 дамоў, а ўсяго за пяць год пасля вызвалення вобласці — 48744 дамы.

Гэтыя поспехі ў аднаўленні сельскай гаспадаркі сталі магчымы толькі дзякуючы самаахвярнай працы калгаснага сялянства і велізарнай дапамогі, аказанай вобласці, як і ўсёй нашай Беларускай рэспубліцы, саюзным урадам, ЦК ВКП(б) і асабіста таварышам Сталіным.

Толькі ў 1945 г. калгасы вобласці атрымалі насенную пазыку збожжавых 1616 *т*, бульбы — 2100 *т*, ільнонасення — 172 *т*. У вобласць была завезена вялікая колькасць сельскагаспадарчых машын: трактараў, камбайнаў, малатарань, аўтамашын і іншага сельскагаспадарчага інвентара.

Для аднаўлення жывёлагадоўчых ферм калгасы вобласці атрымалі з усходніх абласцей РСФСР тысячы галоў коней, буйнай рагатай жывёлы, авечак, свіней і птушкі.

Аднак, не гледзячы на значную работу, праведзеную ў сельскай гаспадарцы, і вялікую дапамогу, аказаную ўрадам, цяжкія вынікі нямецкай

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы